# Пачатак

Ненавіджу, калі па мне страляюць.

Так я паспеў падумаць тады, калі валіўся за парапет ля падземнага пераходу.

Пазней некаторы час я анічога не думаў.

У прыбіральні на другім паверсе «Арэны», ля запэцканага люстэрка, я зірнуў на кавал скуры, які матляўся над левым вухам, і меланхалічна заўважыў: гісторыя, трасца на яе, не проста паўтараецца — яна цалкам складзеная з шаблонаў. Косткі для гульні і камбінацыі выпадаюць амаль тыя ж самыя.

А яшчэ я падумаў пра тое, што я палахлівы нікчэмны баязлівец.

І надта гэтым задаволены.

Бо я зусім не мой дзед Аніська — ані стаццю, ані мужнасцю. І любоў да радзімы ў мяне суцэльна іншая, асабліва калі ў мяне страляе амаль родны пляменнік, хай і гумавымі кулямі.

Бо дзед Аніська пабег не ад стрэльбы, а на яе, і з таго часу ў дзеда Міхала засталіся крывы нос

і толькі адзіны зуб спераду на верхняй сківіцы. Але ж дзед Аніська не забіў, толькі забраў стрэльбу.

Ну, з іншага боку, дзед Міхал асмеліўся самнасам сустрэцца з Аніськай у лесе.

Трэба казаць, што я не надта доўгі час думаў пра дзядоў, бо з драпін на галаве льецца надзіва шмат крыві, і з-за таго выгляд нібы ў ахвяры Лядовага пабоішча, якога насамрэч і не было, але ж не ў гэтым справа. На параненых палююць усе, ад даішнікаў да пракурораў, а калі ўпалююць, то дадуць яшчэ, а пасля і завядуць справу, каб не думаў скардзіцца з-за пабояў. Таму я абклаў галаву шкарпэткамі, зірнуў у люстра, вылаяўся і ўпарта крочыў вонкі, на калідор, дзе праз тры дзверы знаходзіліся крама «Хай адвенчура» і пара аслупянелых дзевак у ёй. Дзеўкі аслупянелі да такой ступені, што прадалі мне ўсё, што я прасіў, і нават не віскнулі, калі я пераапрануўся ва ўсё новае й прымасціў на галаву, прама на шкарпэткі з крывёю, спачатку гумавую стужку, а пасля бафу і стаў падобны на звар’яцелага тэнісіста.

А пасля я сядзеў у «Піца Тэмпа» на гэтым жа паверсе, мэтанакіравана жор піцу «Кальцонэ» і запіваў мінеральнай вадой вытворчасці алігарха Тапузідзіса. Сядзеў я ля высокага, ва ўсю сцяну, акна і бачыў, што ў завулках у элітным селішчы за «Арэнай» кішма кішаць чорныя і працавіта хапаюць тых, хто меў намер прабегчы

праз «Арэну» і схавацца сярод забудовы сярэднім коштам у мільён долараў за асабняк. Хапалі надта жыва й драматычна, я пазіраў і жор піцу, і, напэўна, таму не паспеў напалохацца, калі чорныя раптам апынуліся з іншага боку, гэта значыць ля майго стала. Аднак чорныя звычайна рэагуюць толькі на моцны пах страху, і таму асаблівай зацікаўленасці я ў іх не выклікаў. Яны ўзяліся за хлопчыка ў акулярах і з валасамі да плеч. Дарэчы, калі яго білі, то ў мяне паваліласяна стале бутэлька з колай, але я не стаў скардзіцца і толькі моўчкі назіраў за тым, як хлопчыка валакуць вонкі. Валаклі двое, а трэці ішоў ззаду і нёс пабітыя акуляры.

І толькі калі яны сышлі, мяне праняло. Бо з імі ж мог зайсці і мой амаль родны пляменнік Міхал — той самы, які ў мяне страляў.

# Дзед N1

Вы, напэўна, здзівіцеся, але пляменнік Міхал страляў у мяне менавіта таму, што дзед Міхал страляў у дзеда Аніську ў чэрвені сорак другога ў сасновым лесе пад мястэчкам Добруш. Вядома, пляменнік Міхал страляў яшчэ і таму, што трэ было адпрацоўваць грошы за дзень, які лічыўся баявым, і таму, што на Міхала пазіралі камандзіры і падначаленыя, а тады страляць лёгка й прыемна, але ж гэта не надта істотная нагода ў параўнанні з тым, што дзед Міхал страляў у дзеда Аніську, а дзед Аніська не забіў Міхала. Хаця тыя зубы і нос, а таксама два рэбры і прамянёвую костку на левай руцэ дзед Міхал памятаў да скону жыцця, і калі на зборах радзіны бывала застолле, Міхала з Аніськай садзілі па розныя бакі стала. Крыху падпіўшы, Міхал заўжды крычаў, што ўзгадае і на зубы, і на рэбры, і лез біцца, і аднойчы па недаглядзе Аніська выбіў яму апошні зуб спераду на верхняй скіўіцы.

Міхал яшчэ крычаў пра тое, што ўзгадае і на кароў, і на сядзібу, і на саўзнакі. І крычаў пра траіх сваякоў, якіх Аніська справадзіў у Сібір. А тады Аніська крычаў пра тое, што Міхал, вылюдак, здаў немцам пляменніцу Аніські, а тыя яе расстралялі. Тады Міхал крывіўся і казаў, што тая пляменніца лясным бандзюганам, якія апошнюю ежу ў людзей кралі, наводчыцаю была ды трымала маліну, а як схапілі ды паціснулі, адразу ж сракай пацякла й усё выклала.

Пасля гэтых слоў Аніська звычайна лез біцца, і яго трэба было перахопліваць з немалою рызыкаю для сябе, бо Аніська быў моцны, хаця і хварэў шмат пасля вайны. Здаралася, што і не перахоплівалі.

Аднойчы за стол неяк патрапіў Міхалаў сваяк з Кадлупоў. Кадлупоўскіх сваякоў добрушскія аніколі раней не звалі, а кадлупоўскія настойліва звалі, але ж добрушскія аніколі не ехалі. Пасля і Міхалавы, і Аніськавы доўга і асцярожна высвятлялі, хто заклікаў гэтага з Кадлупоў, але ж ніхто не прызнаўся.

Прынамсі, хату ўсё ж такі адрамантавалі да зімы. І абышлося без таго, каб патрабаваць з кадлупоўскіх грошай. І добра, бо грошай у кадлупоўскіх усё роўна не было ніколі, што з'ўлялася таксама вялікай таямніцай, бо яны амаль не пілі, але ж гэта іншая справа і пра яе тут гаворка не пойдзе.

А гаворка пойдзе пра тое, што дакладна даведацца пра мінуўшчыну альбо нават сучаснасць у маёй радзіны амаль немажліва. Не, калі пра колькасць нябожчыкаў ці паломаных костак альбо тое, хто з кім ажаніўся і каго нарадзіў, — то, вядома, мо і нават крыху занадта, асабліва пасля трэцяй. А вось пра астатняе… Розныя кажуць рознае, і нават адныя й тыя ж кажуць рознае і падчас адной гаворкі. Калі спрабуеш давесці пра супярэчнасць, то ў залежнасці ад узросту альбо крыўдзяцца, альбо хітра ўсміхаюцца і кажуць, што такі ты ў нас малады ды разумны. Аднак найгоршае тое, што яны часцяком і самі шчыра вераць у тое, што гавораць у любую дадзеную хвіліну.

Усё ж нешта я не веру ў тое, што радзіна Аніські да рэвалюцыі валодала даўжэзнай дамінай з доўгай шыкоўнай цэглы і з коштам у палову Навабеліцы, асабліва ўлічваючы тое, што Аніська пэўны час працаваў шафёрам у НКУС.

І недавер мой дзівосным чынам пацвердзіў аргенцінскі чалавек Пабла Вавялюк, але пра гэта крыху пазней.

Дом стаў першым вялікім каменем у падмурку катастрофы. Другі склаўся з гусей, бімберу, сліў, сваяка Гапона ды саўзнакаў, тых самых, пра якія спявалі: «Забягаю я ў буфет, ні капейкі дзенег нет, размяняйці дзесяць міліонаў».

Сваяк Гапон па добрушскіх мерках быў гаспадар заможны, меў статак гусей і тры каровы, а

яшчэ слівавы сад, вялікі й надта пладаносны. Гапон спрабаваў гнаць са сліў, але нешта не выходзіла: і смярдзела, і няшмат вылівалася. Тады Гапон прыдумаў гнаць з бульбы, а на слівах настойваць, і вось тое выходзіла ну проста божы цуд. Па слівянку да Гапона хадзілі ажно вахлакі з-за Іпуці. Гапон ужо думаў набыць хату і чацвёртую карову. Аднак паўстала праблема: а што рабіць са слівамі пасля таго, як на іх настаялася? Шкада ж выкідваць. Бо іх шмат, яны смачныя і насачыліся гарэлкаю...

Гапон з’еў прыблізна трацiну вядра.

На ягоны віскат збеглася ўся вуліца. Гапон выў, біў сябе кулакамі па пузе, крычаў, што гарыць унутры, і патрабаваў яго, Гапона, забіць на месцы, бо невыносна. І тады малады яшчэ Аніська даў першую пагібельную параду. Ён параіў пакласці Гапона на дошкі, паліваць ледзяной вадою ды катаць туды-сюды, каб растрэслася. Праз чатыры хвіліны і два вядра вады слівы палезлі ў Гапона з усіх дзірак. Слівы не толькі лезлі, а яшчэ і вымётваліся, вырыгваліся, выцякалі і нават выскоквалі на пару сажняў. І не ўсе назіральнікі паспелі адбегчы.

Аніська крыху пакрыўдзіўся, бо Гапон нават і не падзякаваў, але ж скардзіцца не стаў, бо з таго лекавання прымаўка «нажорся, як Гапон сліў» разышлася па ўсім Добрушы, і тыя, хто прымаўляў, нядобра й злавесна пасміхаліся.

Чарга другой пагібельнай парады надышла, калі Гапон, узненавідзеўшы слівы, выкінуў на сметнішча ўсе рэшткі ад настойкі. Але ж сметнішча было сваё, непадалёк ад дома, каб там гніло ды ствapала карыснае дзярмішча дзеля ўгнаення.

Сваю памылку Гапон зразумеў, калі на дзікі віскат жонкі збеглася ўся вуліца. На падворку ляжалі два тузіны гусей. І не варушыліся. І вось тады Аніська нарадзіў другую параду.

— Ну, засталося хоць што карыснае з іх спагнаць, пакуль не згнілі, — мудра заўважыў ён і пацепнуў плячыма.

Увесь вечар дачкі і сыны Гапона пад кіраўніцтвам няўцешнай Гапонавай жонкі скублі няшчасных гусей. А ўпоцемку голых нябожчыкаў пакідалі ў яр за садамі.

Раніцаю гусі абудзіліся, гагочучы, і голыя патэпалі дахаты. Гапонава жонка вішчала дзве гадзіны, бо напачатку адмовілася пускаць прывідняў і спрабавала застрашыць голых гусей іконаю Божай маці. Гусі крыўдзіліся й лезлі біцца. Вуліца рагатала. Гапон лез біцца з вуліцай. Гусі лезлі да Гапона.

А падушак, якія набіла Гапонава жонка, так аніхто і не набыў.

Пячатка на злы лёс паставілася тады, калі Аніська прыйшоў да Гапона і сказаў, што яго збіраюцца раскулачваць. Аніська ўжо тады працаваў у органах і ведаў. Тым болей асаблівай таямніцы з таго не рабілі. Гапон да таго разгубіўся, што, па-першае, запусціў Аніську ў дом і

нават пачаставаў, а па-другое, прадаў усіх кароў і гусей не каму-небудзь, а кадлупоўскім. І не за чырвонцы, а за саўзнакі, і спачатку палічыў, што прадаў з вялікаю выгадаю, бо яму адлічылі ўдвая за курс абмену саўзнакаў на чырвонцы.

Толькі праз тыдзень Гапону распавялі пра тое, што саўзнакі болей не абменьваюцца на чырвонцы.

Гапон абклеіў саўзнакамі прыбіральню і загадкава раіў кожнаму госцю наведаць «самы багаты нужнік» у горадзе. Праз два тыдні Аніська сустрэў Гапона на вуліцы — у дом Гапон яго ўжо ўсё роўна не пусціў бы — і параіў неадкладна абадраць саўзнакі, бо гэта абраза савецкай улады.

І Гапон абадраў.

А пасля малодшая Гапонава дачка пабралася з Міхалам.

Трэба казаць, што з-за працы і з-за пэўных звычак Аніська заўжды стаяў крыху абак радзіны. Не, ён сядзеў за агульным сталом, наведваў, што належала наведваць, і ўсё ж. Калі перад самай вайною памерла ягоная жонка і пакінула яго з чатырма дзецьмі, ён ажаніўся з удавой Агаф'яй з Навабеліцы, у якой было аж шасцёра. Што горш, яна была дачкой даволі заможнага гаспадара, які нават наймаў увосень батракоў.

Мо таму Аніську пакінулі заставацца з немцамі, ствараць партызанскі атрад.

Увогуле, ваенны лёс маёй радзіны з матчынага боку застаўся для мяне цалкам неўра-

зумелым. Я нават спрабаваў напойваць гарэлкаю старэйшую сястру маёй маці, цётку Марыю, каб тая нарэшце распавяла, сапраўды бабку Гашку з маёй маці на руках ганялі праз міннае поле ці не. І ці спрабавалі іх расстраляць. І ці ў лесе іх злавілі альбо выгналі з хаты. І ці насамрэч дзед Аніська забіў тых двух паліцаяў з Веткі, хоць малодшы і быў сваяком першай жонкі.

Распавядалі толькі пра тую сутычку ў лесе з Міхалам, бо гэта ўсіх неяк скаланула. Я і цяпер дакладна не разумею, чаму і што такое абламалася і згубілася сярод радзіны, калі Міхал перадаў праз цётку Марыю звестку пра сустрэчу ў лесе. Я нават не ведаю, менавіта чым Міхал заманіў Аніську і што яны абмяркоўвалі. Але ж, напэўна, Міхал баяўся і таму вырашыў стрэліць у патыліцу, каб адразу забіць, і ці то не пацэліў як трэба, ці то Аніська нешта адчуў — і куля выдрала жмут скуры над левым вухам, а другі раз патрапіць з добрай нямецкай вінтоўкі «Маўзер» Міхал чамусьці не паспеў.

Але ж Аніська, мабыць, насіў з сабою зброю. Я бачыў на старым фота крывую разадраную губу Міхала. Кулаком так не зробіш. А вось рукаяткай нагана дык проста.

Яшчэ ўся радзіна пагаджалася з тым, што, калі Аніська ў сорак трэцім выйшаў з лесу, у яго чамусьці з’явілася карова, і таму мая маці перажыла сорак чацвёрты.